**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ
па скарзе зацікаўленай асобы
на рашэнне аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта

28 траўня 2024 года г. Варашава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III-га склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разгледзеўшы на пасяджэнні скаргу зацікаўленай асобы – Алены Дзядзюлі, кандыдата выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”, рэгістрацыя якога была адменена,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

26 траўня 2024 года ў 08:01 (CET) на адрас Выбарчай камісіі паступіла скарга на рашэнне Выбарчай камісіі аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта ад 24 траўня 2024 года ад зацікаўленай асобы – Алены Дзядзюлі, кандыдата выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”, рэгістрацыя якога была адменена.

Заяўнік просіць Выбарчую камісію аб наступным:

1. Прызнаць Выбарчую камісію некампетэнтнай;
2. Прызнаць выбары нелегітымнымі;
3. Уключыць увесь спіс “Закон і правапарадак” у Каардынацыйную раду.

Разгледзеўшы довады скаргі, Выбарчая камісія не бачыць магчымасцяў здаволіць выкладзеныя ў ёй патрабаванні, зыходзячы з наступнага.

Па-першае, Выбарчая камісія не прымае рашэнні аб чыёй-небудзь кампетэнтнасці або некампетэнтнасці. Рашэнні такога кшталу не прадугледжаны Палажэннем і не цягнуць за сабой юрыдычных наступстваў. Акрамя таго, дадзенае патрабаванне не мае дачынення да прадмету скаргі (неправамернасці рашэння Выбарчай камісіі).

Па-другое, Выбарчая камісія не надзелена паўнамоцтвамі прызнаваць выбары нелігітымнымі. Легітымнасць – гэта ацэначная катэгорыя, разважаць пра якую могуць назіральнікі за выбарамі, кандыдаты, выбаршчыкі, іншыя суб’екты, але не Выбарчая камісія. Акрамя таго,

дадзенае патрабаванне не мае дачынення да прадмету скаргі (неправамернасці рашэння Выбарчай камісіі).

Па-трэцяе, згодна з Палажэннем кандыдаты выбарчага суб’екта могуць атрымаць мандаты ў Каардынацыйнай радзе **толькі ў выпадку іх абрання на выбарах**. З гэтай прычыны ўключэнне кандыдатаў выбарчага суб’екта ў склад Каардынацыйнай рады немагчыма, паколькі гэта супярэчыць дэмакратычным працэдурам фармавання прадстаўнічага органа.

Такім чынам, Выбарчая камісія не лічыць слушнымі довады заяўніка аб неправамернасці прынятага рашэння аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак” і не бачыць магчымым здавальненне просьбаў, выкладзеных у скарзе. Кіруючыся падпунктамі 4.9-4.12 пункта 4 Палажэння, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

У здавальненні скаргі на рашэнне Выбарчай камісіі аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта, пададзенай зацікаўленай асобай – Аленай Дзядзюляй, кандыдатам выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”, рэгістрацыя якога была адменена – адмовіць.

Паведаміць заяўніку, што рашэнне Выбарчай камісіі можа быць паўторна абскарджана ў тэрмін 24 гадзіны з моманту яго атрымання.

Старшыня Выбарчай камісіі  А. Прыходзька